# ПРА НАЗВЫ ВУЛІЦ МАЗЫРА

***Кунгер К.Я.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Назвы сучасных вуліц Мазыра на падставе семантычных характарыстык можна спарадкаваць у наступныя групы:

– урбанонімы, утвораныя ад імёнаў вядомых людзей – пераважна палітычных дзеячаў, кіраўнікоў партыі і ўрада: вуліцы – *Ленінская, С. Кірава, М. Фрунзэ, Ф. Дзяржынскага, М. Калініна, Н. Крупскай, В. Куйбышава, І. Смоляра, І. Ветрава*, плошча *Леніна* і інш.

– урбанонімы, утвораныя ад імёнаў вядомых военачальнікаў, герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў: вуліцы – *Г. Жукава, М. Шчорса, В. Чкалава, Р. Катоўскага, М. Малініна, П. Бялова*, М. *Катлаўца, М. Барысава, К. Вікенцьева, К. Захарава, М. Шмаргуна, П. Бумажкова, В. Харужай, Я. Талкачова, М. Данілеўскага, А. Іваненкі, Г. Саета, М. Катаева, В. Няжнова, Р. Коблава* і інш.;

– урбанонімы, утвораныя ад імёнаў пісьменнікаў, дзеячаў мастацтва: плошча *М. Горкага*, вуліцы: *А. Пушкіна, Л. Талстога, Я. Коласа, Я. Купалы, І. Мележа*;

– урбанонімы, якія адлюстроўваюць савецкі перыяд: вуліцы: *Кастрычніцкая, Інтэрнацыянальная, Пралетарская, Савецкая, Камуністычная, Ю. Гагарына, 8-га Сакавіка*; бульвары: *Юнацтва, Дружбы, Страканіцкі*;

– урбанонімы, якія падкрэсліваюць, указваюць на асаблівасць мясцовага ландшафту, на іншыя прыродныя адметнасці: мікрараёны – *Зарэчны, Усходні*; вуліцы: *Зарэчная, Нагорная*; завулак *Бярозавы*;

– урбанонімы, звязаныя з найменнямі людзей па прафесіі, роду заняткаў, нацыянальнасці, вытворчай дзейнасці: завулак *Спартыўны*; вуліцы: *Будаўнікоў, Партовая*; завулкі: *Першы Партовы, Другі Партовы, Трэці Партовы, Піянерскі* і інш.

Такім чынам, сярод мемарыяльных урбанонімаў у гонар тых або іншых дзеячаў дамінуюць у сучасным наборы назваў вуліц Мазыра не мясцовыя, а чужародныя для беларускага тапанімічнага ландшафту прысвячэнні-ўрбанонімы гістарычным асобам, якія непасрэдна не былі звязаны з гэтым горадам ці Палессем (вуліцы ў гонар *М. Калініна, С. Кірава, К. Варашылава, В. Куйбышава, Р. Катоўскага, С. Лазо, В. Чапаева)* і інш.

МГПУ им. И.П.Шамякина